лі цікавасць да культуры бел. народа, спрыялі развіццю даследаванняў па бел. праблематыцы. *У. Л. Сакалоўскі.*

**АРЦЕ́ЛЬ БУДАЎНІ́ЧАЯ,** арцель дойлідаў. На тэрыторыі Беларусі А. б., якімі кіравалі майстры-самавукі, вядомы ў 12—17 ст. Складаліся з некалькіх дзесяткаў (да 30 чал.) кваліфікаваных рамеснікаў-муляраў і некалькіх цесляроў. У 12 ст. ў іх уваходзілі таксама майстры па вырабу плінфы і нарыхтоўцы вапны. Майстры-цагельнікі сваю прадукцыю мецілі спец. знакамі (клеймамі).

У 1-й пал. 12 ст. былі 2 самастойныя арцелі — у Полацку і Віцебску. У 12—13 ст. існавалі вандроўныя, манастырскія і княжацкія А. б. Полацкія майстры працавалі таксама ў Смаленску, Ноўгарадзе, Мінску, Навагрудку, з іх дапамогай у 2-й пал. 12 ст. створана А. б. ў Гродне. У познім сярэдневеччы майстры, якія выраблялі цэглу і чарапіцу, выйшлі са складу А. б., працавалі самастойна і прадавалі сваю прадукцыю заказчыку. У буйных гарадах у 16—18 ст. дзейнічалі таксама цэхі муляраў і цесляроў. Побач з імі з 16 ст. працавалі прафес. архітэктары, якія абслугоўвалі пераважна магнатаў. У 18—19 ст. у сувязі з падзелам праектнай і буд. работ паміж архітэктарамі і будаўнікамі-практыкамі рамкі іх дзейнасці звужаюцца, і А. б. паступова знікаюць. *А. А. Трусаў.*

**АРЦЕ́МІЙ,** рускі царк. дзеяч, пісьменнік-публіцыст 16 ст., прыхільнік несцяжацеляў, выступаў супраць афіц. іасіфлянскай ідэалогіі. Узначальваў гурток, у які ўваходзілі Феадосій Касы, Ігнацій, Васіян. У 1551 ігумен Троіца-Сергіева манастыра, які пакінуў з прычыны ідэйных разыходжанняў з іасіфлянамі. У 1554 адлучаны ад царквы як ератык і сасланы ў Салавецкі манастыр, адкуль у 1554—55 уцёк у Вял. кн. Літоўскае. Жыў пры доме слуцкіх князёў Алелькавічаў. У сваіх пасланнях абараняў праваслаўнае веравызнанне, асуджаў манастырскае землеўладанне, заклікаў да маральнага самаўдасканалення. З 14 пасланняў 9 накіраваны супраць рэфармацыйнага руху на тэр. Вял. кн. Літоўскага. Вёў актыўную палеміку з С. *Будным.*

*Тв.:* Послания старца Артемия, XVI век.— У кн.: Памятники полемической литературы в Западной Руси. Кн. 1. СПб., 1878.— (Русская историческая библиотека; т. 4).

*Літ.:* Зимин А. А.. И. С. Пересветов и его современники.— М., 1958; Очерки истории философской и социологической мысли Белоруссии (до 1917 г.).— Мн., 1973. *У. Г. Карот кі.*

**АРЦЁМАЎ** Пётр Сяргеевіч (н. 4.7.1941, в. Воткіна Хвастовіцкага р-на Калужскай вобл.), беларускі савецкі мастак дэкар.-прыкладнога мастацтва. Чл. КПСС з 1965. Скончыўшы Бел. тэатр.-маст. ін-т (1969), працуе гал. мастаком



П. Арцёмаў. Набор дэкаратыўных ваз. 1981.



К. Арцёменка. «Ураджай». 1973.

Барысаўскага хрусталёвага з-да імя Дзяржынскага. У маст. выстаўках удзельнічае з 1970. У галіне маст. шкла распрацаваў асартымент масавых вырабаў з бясколернага хрусталю, бясколернага шкла (пітны прыбор «Адуванчык», 1976), танкасценнага посуду з каляровага шкла пастэльных таноў (сталовы сервіз, 1976). Асабліва часта выкарыстоўвае вертыкальныя двухгранныя парэзкі накшталт канелюраў у спалучэнні з лінзамі круглай і авальнай формы. Хрусталёвыя вырабы А. вызначаюцца манументальнасцю буйных форм у таўстасценным посудзе, канструктыўнасцю ў пабудове складаных цыліндрычных аб'ёмаў (вазы «Кольцы», 1973; сталовы сервіз «Хлебасольны», 1979). Часта будуе кампазіцыі на проціпастаўленні рознавысокіх цыліндрычных аб'ёмаў (камплект ваз «Арбіта», 1978; прыбор для курэння, 1974).

*Літ.:* Беларускае мастацкае шкло.— Мн., 1978. *М. М. Яніцкая.*

**АРЦЁМЕНКА** Кацярына Гаўрылаўна (н. 10.10. 1925, с. Пяскі-Радзькаўскія Бароўскага р-на Харкаўскай вобл.), майстар пляцення маст. вырабаў з саломы. Засл. работнік культуры БССР (1980). Чл. КПСС з 1971. Удзельнік Вял. Айч. вайны. З 1963 мастак Магілёўскай ф-кі маст. вырабаў. У выстаўках удзельнічае з 1965. З'яўляецца заснавальнікам на ф-цы промыслу саломапляцення. У творчасці ваенна-рэв. тэматыка («Дадзены загад», 1974; «Тачанка», 1972), этнаграфічныя і бытавыя сюжэты («Вяселле», 1970; «Беларускія дзяўчаты», «Ураджай», абедзве 1973; «Хлеб-соль Магілёўшчыны», «Тройка», «Конь-агонь», усе 1974), анімалістычная тэматыка (дэкаратыўна-прыкладныя творы — цукерніцы, каўшы, хлебніцы і інш.— у выглядзе жывёл і птушак). Ужывае розныя тэхнікі пляцення, творча выкарыстоўваючы тэхнал. магчымасці саломы. Лаўрэат 1-га Усесаюзнага фестывалю самадзейнай маст. творчасці працоўных (1975—77). Творы экспанаваліся на выстаўках у НРБ, СФРЮ. Лепшыя работы знаходзяцца ў Дзярж. маст. музеі БССР, Дзярж. музеі БССР і інш. *Я. М. Сахута.*

**АРЦЁМ'ЕЎ** Савін, ювелір 17 ст. з Полацка. Перасяліўся ў Маскву і працаваў ў Сярэбраным палаце Маск. Крамля. У 1661 разам з

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ